## Што рабіць, калі ў вас патрабуюць дакументы?

*(Парады ад Андрэя Бастунца, намесніка старшыні ГА “БАЖ”)*

Па-першае, трэба спакойна ўдакладніць, хто гэта робіць. Такое права маюць супрацоўнікі міліцыі ці органаў аховы, калі падзеі адбываюцца на рэжымным аб’екце. Зразумела, калі супрацоўнік міліцыі ў форме, дакументы трэба паказаць. Але пажадана ўдакладніць асобу, якая іх патрабуе, і запытаць, з якой нагоды. Бо, паводле арт. 25 закона “Аб органах унутраных спраў”, іх супрацоўнікі маюць права правяраць дакументы, якія пацвярджаюць асобу:

- пры падазрэнні ў здзяйсненні крымінальных злачынстваў ці адміністратыўных правапарушэнняў,
- для праверкі выканання правіл, за якімі сочыць міліцыя (напрыклад, рэгістрацыя).

Дакументамі, якія пацвярджаюць асобу, могуць быць пашпарт ці, напрыклад, журналісцкае пасведчанне. Калі вы дэманструеце пасведчанне сябра ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” (ці іншай грамадскай арганізацыі), памятайце, што яно сведчыць пра вашу прыналежнасць менавіта да арганізацыі, але не з’яўляецца службовым пасведчаннем журналіста СМІ і не сведчыць пра ажыццяўленне вамі журналісцкай дзейнасці ад імя (ці па заданні) грамадскага аб’яднання.

Акрамя згаданых дакументаў, можна карыстацца пасведчаннем супрацоўніка нейкага сайта (ці, яшчэ лепш, рэдакцыі зарэгістраванага СМІ, для сайта якога вы робіце здымкі), ваенным білетам і г.д.

Грамадзянін не абавязаны адказваць, для каго і з якой нагоды ён робіць відэа- і кіназдымкі (як і, дарэчы, з якой нагоды ён знаходзіцца ў тым ці іншым месцы). Заўсёды памятайце пра артыкул 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: “Ніхто не павінен быць змушаны да дачы паказанняў і тлумачэнняў супраць самога сябе, членаў сваёй сям’і, блізкіх сваякоў. Доказы, атрыманыя з парушэннем закона, не маюць юрыдычнай сілы.” Але можна і патлумачыць: для сябе, ствараю фільм, для сайта…

На практыцы былі выпадкі, калі супрацоўнікі міліцыі казалі - маўляў, ёсць інфармацыя, што падобная камера была скрадзеная і знаходзіцца ў вышуку, і настойліва прапаноўвалі “праехаць у міліцыю”. Гэткія “прапановы” ігнараваць немагчыма, але ж запытайцеся, ці ёсць у іх заява з нагоды “крадзяжу”, і патлумачце, што вы будзеце гэтыя дзеянні абскарджваць (тлумачце спакойна). Калі справа дойдзе да вымання абсталявання ці касет, патрабуйце складання адпаведнага пратаколу і запісвайце ў яго ўсе свае заўвагі. Але яшчэ да гэтага неабходна звязацца з юрыстам.

***ВАЖНА:*** *Згодна з арт. 62 Канстытуцыі, “кожны мае права на юрыдычную дапамогу для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод, у тым ліку права карыстацца У ЛЮБЫ МОМАНТ дапамогай адвакатаў І ІНШЫХ СВАІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ у судзе, іншых дзяржаўных органах, органах мясцовага кіравання, на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях, грамадскіх аб’яднаннях і ў дачыненнях са службовымі асобамі і грамадзянамі... Супрацьдзеянне аказанню прававой дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь забараняецца”.*

*Сяброўства ў грамадскай арганізацыі дазваляе патрабаваць запрашэння ў якасці вашага прадстаўніка ўпаўнаважанай асобы гэтай арганізацыі. Але да непасрэднай вашай абароны падчас адміністратыўнага працэсу яна не будзе дапушчаная. Бо, нягледзячы на канстытуцыйныя палажэнні, сёння, паводле беларускага КаАП, абараняць асобу, якая прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасці, можа толькі адвакат.*

*Таму, калі вы ўжо адчуваеце залішнюю заўвагу да сваёй вашай асобы з боку сілавых ведамстваў ці асцерагаецеся, што можаце стаць ахвярай правакацыі, лепш за ўсё заключыць папярэдняе пагадненне з адвакатам (бо адвакаты дзейнічаюць толькі на падставе пагаднення).*